УДК 94,438 «1919–1922»

# БАРАЦЬБА СЯЛЯНСКІХ ПАРТЫЙ У ЗАКАНАДАЎЧЫМ СЕЙМЕ II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1919–1922 гг.) ПА ПЫТАННЮ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ

***В.П. ГАРМАТНЫ***
*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Разглядаемае пытанне знайшло адлюстраванне ў працах польскіх гісторыкаў Ежы Баркоўскага [5], Хенрыка Цымека [8], Марціна Дрэвіча [9], Зыгмунта Хеммерлінга [11] і г. д., але ў беларускай гістарыяграфіі дадзенае пытанне асобна не разглядалася (за выключэннем часткова А.А. Сарокіна [2]), таму дадзены артыкул з'яўляецца аўтарскай спробаю запоўніць гэты прабел. Метадалагічную базу даследавання склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці, імкненне разгледзець азначанае пытанне ў кантэксце тагачаснай канкрэтна–гістарычнай сітуацыі.

**Асноўная частка.** З аднаўленнем 11 лістапада 1918 г. дзяржаўнай незалежнасці перад уладамі міжваеннай Польшчы (ІІ Рэчы Паспалітай) паўстаў цэлы шэраг сацыяльна–эканамічных і грамадска–палітычных пытанняў, ад вырашэння якіх залежыў далейшы лёс дзяржавы. Адным з самых актуальных і злабадзённых пытанняў у гэты час стала аграрная праблема [7, s. 152; 19, s. 13]. Міжваенная Польшча была сельскагаспадарчай краінай і на вёсцы пражывала каля ¾ яе насельніцтва, для якога сельская гаспадарка была адзіным сродкам існавання. У аграрнай галіне захоўвалася значная колькасць перажыткаў з часоў паншчыны (наяўнасць буйнога памешчыцкага землеўладання, сервітутаў, цераспалосіцы і г.д.), а таксама вельмі неспрыяльнае становішча ў сферы землеўладання: з аднаго боку знаходзілася беззямельнае і малазямельнае (з надзеламі да 5 га) сялянства (складалі 61,6% вясковага насельніцтва і валодалі каля 15% зямлі), а з другога – буйныя гаспадаркі (больш 50 га) і ўладальнікі памешчыцкіх маёнткаў (1% і 48% адпаведна) [6, s. 128].

Сяляне і сельскагаспадарчыя рабочыя знаходзіліся ў гэты час на самым нізе сацыяльнай лесвіцы ў адносінах да ўзроўню жыцця, адукацыі і прэстыжу заняткаў: сярод вясковага насельніцтва быў найвышэйшы ўзровень непісьменнасці па краіне. Вёска была перанаселена, і па ацэнках даследчыкаў тут знаходзілася каля 4 500 000 «лішніх» людзей [21, s. 69–70]. Каля 20% зямлі ўваходзіла ў склад 1 964 буйнейшых маёнткаў (0,06% ад усіх), якія налічвалі больш чым па 1 000 га і дасягалі нават 200 000 га, што было прыкладна роўна сярэдняга памера павету. Асабліва цяжкая сітуацыя ў галіне сельскай гаспадаркі склалася на землях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны [6, s. 128], якія падчас Першай сусветнай (1914–1918 гг.) і савецка–польскай (1919–1921 гг.) войнаў панеслі самыя адчувальныя страты. Акрамя таго, аграрнае пытанне тут цесна перапляталася з нацыянальным, бо адносіны мясцовага сялянства да польскага панавання шмат у чым залежалі ад надзялення іх ворнаю зямлёй [15, s. 131]. У такіх надзвычай складаных умовах польскім уладам неабходзен быў пошук варыянтаў далейшага развіцця краіны і тэрміновае вырашэнне злабадзённых праблем. Разам з тым неабходна адзначыць, што сяляне–палякі прымалі актыўны ўдзел у барацьбе за незалежнасць Польшчы, былі шчыра зацікаўлены ў росквіце польскай дзяржаўнасці, бралі ў гэтым працэсе актыўны ўдзел і таму заслужылі ад урада ўдзячнасць і павагу [19, s. 13].

Азначаныя праблемы павінен быў вырашыць Заканадаўчы Сейм (Sejm Ustawodawczy), выбары якога аб'яўлены 28 лістапада 1918 г. і прызначаны на 26 студзеня 1919 г. [9, s. 17]. У сілу рознага роду прычын (перш за ўсё вядзення савецка–польскай вайны і неўрэгуляванага тэрытарыяльна–адміністратыўнага падзела краіны) некаторыя мясцовасці галасавалі ў іншыя дні [4, s. 4; 11, s. 48–51]. Упершыню ў гісторыі Польшчы ўсе сяляне і жанчыны, старэйшыя за 21 год, атрымалі выбарчае права, што было яскравым сведчаннем дэмакратызацыі грамадска–палітычнага ладу. Камуністы байкатавалі выбары ў Сейм, таму асноўная барацьба ў перыяд выбарчай кампаніі разгарнулася паміж сялянскімі і правымі партыямі краіны [6, s. 130; 12, s. 198].

Асаблівую актыўнасць пад час выбарчай кампаніі ў Заканадаўчы Сейм праявілі сялянскія партыі (з пол. ludowcy, людоўцы), якія абвяшчалі сябе заступніцамі інтарэсаў сялянства. Азначаныя партыі адвяргалі рэвалюцыйны шлях вырашэння праблемы, сцвярджалі, што рэвалюцыя знішчыць толькі што адроджаную польскую дзяржаву і таму планавалі вырашыць аграрнае пытанне шляхам прыняцця адпаведнага закона; у сваіх праграмах патрабавалі ажыццяўлення парцэляцыі (падзелу) значнай часткі памешчыцкіх маёнткаў і выкупу гэтай зямлі сялянамі па невялікім кошце, перабудовы сучаснага ім аграрнага ладу краіны з апораю на моцныя сялянскія гаспадаркі сямейнага тыпу [5, s. 69; 7, s. 153]. Людоўцы падкрэслівалі, што сялянства з'яўляецца дамінуючай групай польскага народа і не займае адапаведнага месца ў сацыяльнай іерархіі, і таму паставілі сваёй галоўнай мэтай дапасаваць да яго патрэб і інтарэсаў гаспадарку дзяржавы і палітыку ўрада, а перш за ўсё дабіцца ажыццяўлення на выгадных для яго ўмовах аграрнай рэформы [21, s. 70].

Варта адзначыць, што сялянскі рух міжваеннай Польшчы не быў адзіным, што стварала значныя цяжкасці ў дасягненні пастаўленых задач. Сярод тагачасных сялянскіх партый краіны неабходна перш за ўсё адзначыць Польскую Народную Партыю «Пяст» (Polskie Stronnictwo Ludowe «Piast» на чале з Вінцэнтам Вітасам, Wincent Witos) і Польскую Народную Партыю «Вызваленне» (PSL «Wyzwolenie», лідар Блажэй Сталярскі, Błażej Stolarski), а таксама Польскую Народную Партыю «Лявіца» Яна Стапіньскага (PSL «Lewica», Jan Stapiński) [18, s. 371–372, 376–377, 430–433]. Погляды сялянскіх партый па розных аспектах сацыяльна–эканамічнага жыцця краіны значна разыходзіліся, але ў адносінах да ажыццяўлення аграрнай рэформы былі даволі блізкімі, што стварала магчымасці для далейшага збліжэння і супрацоўніцтва.

Па выніках выбараў у Заканадаўчы Сейм сялянскія партыі атрымалі 117 пасольскіх (дэпутацкіх) мандатаў з першапачатковых 340 (канчаткова 432 у сакавіку 1922 г.): ПНП «Вызваленне» – 59, ПНП «Пяст» – 46 і ПНП «Лявіца» – 12. Адначасова сяляне ўвайшлі і ў склад прадстаўнікоў ад правых партый (яшчэ каля 10 месц), аб чым сведчаць словы В. Вітаса: «Сяляне ўвайшлі ў парламент не толькі як цэлае, але як часткі розных партый, вельмі істотна адрозніваючыхся з поглядах і часта моцна ненавідзячых адно аднаго… Былі (яны) і на крайне правым флангу, знаходзіліся і ў цэнтры, не было іх недахопу і на левым баку» [12, s. 206]. Правыя партыі (перш за ўсё Народна–Нацыянальны Саюз, Związek Ludowo–Narodowy) заваявалі большасць у Сейме дзякуючы добра арганізаванай агітацыі і пры падтрымцы дзяржаўных уладаў, каталіцкага духавенства, а таксама гарадскога насельніцтва [14, s. 33].

Вынікі выбараў былі для людоўцаў вельмі паспяховымі і відавочна сведчылі аб зменах у суадносінах палітычнага ўплыву на вёсцы. Пасля абвяшчэння вынікаў выбараў у Сейм перад сялянскім рухам на павестку дня выйшла пытанне арганізацыі міжпартыйных кансультацый. Лідэры людоўцаў не знаходзілі рэальных падстаў паводле праграмных задач для існавання некалькіх партый, а галоўная розніца адзначалася ў справе палітычнай тактыкі.

Заканадаўчы Сейм распачаў сваю працу 10 лютага 1919 г., і ўжо падчас адкрыцця яго першага паседжання Начальнік дзяржавы Юзэф Пілсудскі (Józef Piłsudski) звярнуў увагу паслоў на патрэбу заняцца справаю «неабходных аграрных рэформ ў духу развіцця і вялікіх дэмакратый Захада» [22, s. 39]. Такім чынам, Пілсудскі адзначаў неабходнасць вырашэння аграрнага пытання на ўзор заходнееўрапейскіх краін. На актуальнасць тэрміновага вырашэння аграрнага пытання звяртаў увагу і тагачасны прэм'ер–міністр Ігнацы Ян Падэрэўскі (Ignacy Jan Paderewski), які ў сваёй сеймавай прамове ад 20 лютага падкрэсліваў, што на вёсцы пануе вялікі зямельны голад і сотні тысяч малазямельных сялян працягваюць рукі да працы, хлеба і зямлі, а Польшча стане свабоднай толькі тады, калі ў краіне наступіць справядлівасць і працавіты і цярплівы польскі народ атрымае зямлю, якую ён заслужыў.

20 лютага 1919 г. Вінцэнт Вітас прадставіў на парадак работы Сейма ўнёсак, у якім адзначаў, што існуючыя ў Польшчы фальваркі з'яўляюцца перажыткам з часоў феадалізма і павінны быць размеркаваны паміж беззямельнымі і малазямельнымі вяскоўцамі, бо «ўладальнікамі сялянскіх гаспадарак могуць быць толькі тыя, хто на ёй (зямлі) працуе» [21, s. 71].

Ні адна з палітычных партый міжваеннай Польшчы не адмаўляла неабходнасці правядзення ў краіне аграрнай рэформы і справа ішла ў першую чаргу аб шляхах і метадах яе ажыццяўлення. Аб патрэбе тэрміновай рэалізацыі комплексных аграрных пераўтварэнняў падчас адкрыцця Сейма выступалі з прамовою кіраўнікі большасці сеймавых фракцый. Выпрацоўку праекта аграрнай рэформы Сейм даручыў Зямельнай Камісіі (Komisji Rolnej) на чале з Вітасам, у склад якой увайшлі 30 прадстаўнікоў буйнейшых партый [4, s. 10]. У шэрагах камісіі працавала 10 сялянскіх

ПолесГУ

паслоў, дзякуючы чаму Камісіі ўдалося пераадолець уплыў правых прапамешчыцкіх парламентарыяў.

У Камісію былі накіраваны праекты аграрнай рэформы, прапанаваныя сеймавымі клубамі ПНП «Пяст», ПНП «Вызваленне», ПНП «Лявіца», Польскага Народнага Аб’яднання (Polskie Zjednoczenie Ludowe) і Народна–Нацыянальнага Саюза (Związek Ludowo–Narodowy, ННС). 27 сакавіка 1919 г. на пасяджэнні Камісіі міністр сельскай гаспадаркі і дзяржаўнай маёмасці Станіслаў Яніцкі (Stanisław Janicki) прадставіў урадавы праект, які дэ–юрэ не быў прадметам сеймавага абмеркавання і паслужыў як матэрыял для працы Камісіі [19, s. 194].

Прапанаваныя сялянскімі партыямі праекты ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў былі вельмі блізкі і патрабавалі пераходу на карысць сялян дзяржаўных зямель, царкоўных уладанняў, маёмасці былых пануючых дынастый і прыватных уладальнікаў, аддзяржаўлення належачых да буйной уласнасці лясоў. Розніца паміж азначанымі праектамі назіралася пераважна па вызначэнню максімуму памешчыцкага землеўладання: ПНП «Пяст» выступала за захаванне без кампенсацыі ў памешчыкаў ад 100 да 200 га ў залежнасці ад якасці глебы, ПНП «Лявіца» – не больш 100 моргаў (56 га) [22, s. 40].

У прапанаваным ПНП «Пяст» праекце вельмі крытычна ацэньваліся тагачасныя адносіны ў аграрнай сферы краіны, адзначалася неабходнасць пераходу зямлі ва ўласнасць тых, хто на ёй працуе (гэта значыць сялян), выдачы сялянству ільготных крэдытаў на загаспадараванне і перабудовы аграрнага ладу з апораю на «здаровыя сялянскія гаспадаркі». На думку пястаўцаў, Зямельная Камісія была ў стане на працягу наступных двух месяцаў распрацаваць законапраект аб аграрнай рэформе.

Ян Стапіньскі ад імя ПНП «Лявіцы» патрабаваў як мага хутчэйшага ажыццяўлення аграрнай рэформы і задавальнення пануючага зямельнага голада праз перадачу на карысць малазямельным і беззямельным сялянам зямлі з памешчыцкіх маёнткаў і царкоўных уладанняў. Частка гэтай зямлі павінна была пайсці на карысць сельскагаспадарчых школ і ўзоравых гаспадарак плошчаю ад 10 да 50 моргаў (5,6–28 га), якія належыць стварыць у кожнай гміне. У цэлым патрабаванні ПНП «Лявіцы» былі найбольш радыкальнымі і патрабавалі нават ліквідацыі памешчыкаў як класа [3, s. 17; 14, s. 47].

ПНП «Вызваленне» выступала ў сваім праекце за перадачу патрабуючым сялянам усіх царкоўных і дзяржаўных зямель, уладанняў былых пануючых дынастый на платнай аснове па кошту, які б не абцяжарваў набыўцоў. Вялікія лясныя масівы павінны быць аддзяржаўлены [19, s. 194–196].

Правыя партыі, і перш за ўсё ННС, выступалі за ажыццяўленне абмежаванай аграрнай рэформы і выступалі супраць вызначэння максімуму памешчыцкага землеўладання і прымусовай канфіскацыі лішняй зямлі, за ўсталяванне дзяржаўнага кантроля за зямельным рынкам і ляснымі масівамі, за выдачу сялянам танных крэдытаў і перадачу ім зямлі, якая не належыць памешчыкам, а таксама ажыццяўленне меліярацыі і падтрымкі сялянскай кааперацыі. Прапанаваны праект аграрных пераўтварэнняў павінен быў у выніку ліквідаваць перажыткі з часоў паншчыны і спрыяць развіццю інтэнсіўнай, сучаснай маёнткавай гаспадаркі [21, s. 41].

19 сакавіка 1919 г. распачалася праца Зямельнай Камісіі над прынятымі праектамі, адбылося 16 бурных паседжаняў і ў выніку 22 мая пасол Ян Домбскі (Jan Dąbski, ПНП «Пяст») прадставіў распрацаваны праект «Рашэнне Заканадаўчага Сейма аб асновах аграрнай рэформы» («Uchwały Sejmu Ustawodawczego o przedmiocie zasad reform rolnej»), паводле якога прадугледжвалася прымусовая канфіскацыя з кампенсацыяй залішніх памешчыцкіх зямель пры вызначэнні максімума ў 60–300 моргаў (33,5–168 га) і аддзяржаўленне лясоў [19, s. 200].

3 чэрвеня 1919 г. пад націскам людоўцаў распачалася сеймавая дыскусія па аграрнаму пытанню, якая ахапіла 21 паседжанне Сейма з больш чым 150 заслуханымі працяглымі выступленнямі [20, s. 69]. У сваёй прамове Домбскі адзначыў неабходнасць тэрміновага ажыццяўлення аграрнай рэформы і абгрунтоўваў гэта эканамічнымі і палітычнымі абставінамі, перш за ўсё мэтаю заспакаення ў значнай меры рэвалюцыйна настроенага сялянства, а таксама трансцэндэнтальнымі абставінамі справы, бо сяляне адносяцца да ўласнага кавалка зямлі як да святога. Рэалізацыя рэформы магла б злучыць сялянства з дзяржаваю, павысіць іх агульны і культурны ўзровень, а таксама палепшыць адносіны да польскіх уладаў беларусаў і ўкраінцаў [10, s. 121; 21, s. 71].

Сеймавая дыскусія над прапанаваным праектам насіла вельмі востры характар. Праект аграрнай рэформы таксама актыўна абмяркоўваўся ў перыядычным друку і на мітынгах, якія партыі

ПолесГУ

склікалі ў сваю падтрымку. Спрэчкі перш за ўсё выклікала пытанне вызначэння максімуму памешчыцкага землеўладання, а таксама лёс царкоўных зямель і лясоў. Першапачаткова прадстаўнікі правых партый выступалі супраць прымусовай канфіскацыі, абгрунтоўваючы гэта парушэннем права прыватнай уласнасці і падарваннем асновы існавання дзяржавы, падкрэслівалі, што такі прэцэдэнт магчыма агарне ў будучым прамысловаць, гандаль і нерухомасць. Акрамя таго, памешчыкі падкрэслівалі, што прымусовая канфіскацыя буйнога памешчыцкага землеўладання можа выклікаць з–за гэтага голад у гарадах [19, s. 202]. Прадметам вострай дыскусіі стала і пытанне касцёльнага землеўладання. Паслы–прадстаўнікі духавенства выступалі супраць перадачы ўласнай зямлі на надзяленне малазямельнага сялянства, адзінае выключэнне складаў ксёндз Яўген Окунь (Jugen Okoń), які адзначаў, што такія буйныя зямельныя ўладанні не патрэбныя касцёлу і нават шкодныя і пагібельныя, падкрэсліваў, што святары не могуць быць адначасова добрымі пастырамі і належнымі гаспадарамі вялікіх абшараў зямлі [8, s. 137, 151]. Сам жа Вінцэнт Вітас падкрэсліваў, што не жадае барацьбы з касцёлам, але яго маёнткі не атаясамлівае з правамі касцёла.

Вялікую ролю ў падтрымцы супрацоўніцтва і ўзаемапавагі паміж прадстаўнікамі розных палітычных сіл адыграў маршалак (спікер) Сейма Мацей Ратай (Maciej Rataj, ПНП «Пяст»), які сустракаўся з лідарамі асноўных фракцый і дзякуючы якому ўдалося ў рэшце рэшт прыйсці да некаторага кансэнсуса. Частка памешчыкаў разумела неабходнасць пайсці на некаторыя саступкі сялянам, бо ў іншым выпадку можна было страціць усё. Варта падкрэсліць, што ў Сейме склалася такая сітуацыя, што вызначыць дакладна хто пераможа пры галасаванні – прыхільнікі аграрнай рэформы ці іх апаненты – было напярэдадні немагчымым [22, s. 45].

У такой сітуацыі вельмі важным стала стварэнне 23 чэрвеня 1919 г. аб’яднанага пасольскага клуба сялянскіх партый, у які ўвайшло 134 пасла–прыхільніка аграрнай рэформы. Акрамя таго, людоўцы лічылі, што заваююць значную частку галасоў паслоў–сацыялістаў [19, s. 207]. Пасля доўгіх і працяглых дыскусій 10 ліпеня 1919 г. праект аграрнай рэформы, заснаваны галоўным чынам на пастулатах ПНП «Пяст», быў прыняты Сеймам, але не ў форме закона, а хутчэй маніфеста аб намерах і пажаданнях якой павінна быць аграрная рэформа, фундаментам, на аснове якога будуць распрацоўвацца наступныя законы. Прынятую пастанову не падпісалі маршалак Сейма, прэм’ер–міністр і міністр сельскагаспадарчых рэформ, яна не была надрукавана ва ўрадавым зборы законаў і таму не набыла законную сілу [2, с. 61].

Сейм прызнаваў неабходнасць прымусу пры ажыццяўленні аграрнай рэформы, максімум землеўладання вызначаўся ў памеры 60–180 га ў залежнасці ад рэгіёна, а ў Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне і Сілезіі – да 400 га. Ад прымусовага выкупа пазбаўляліся высокапрыбытковыя і добра механізаваныя гаспадаркі і маёнткі, якія вырошчвалі насенне, рыбу і жывёлу на продаж. На парцэляцыю планавалася накіроўваць не менш 200 000 га штогод з дзяржаўных і царкоўных зямель, уладанняў былых пануючых дынастый, маёнткаў, набытых з дапамогаю ліхвярства і г. д. Гэтыя землі накіроўваліся на надзяленне малазямельных і беззямельных сялян, пры чым новыя гаспадаркі не павінны былі пераўзыходзіць 25 моргаў (14 га). На патрэбы іншых катэгорый сялянства магло пайсці не больш 20% парцэляванай зямлі і павялічыць сваю гаспадарку яны маглі толькі да 40 моргаў (22,5 га). Фальваркавыя лясы падлягалі аддзяржаўленню [9, s. 555–557]. Варта адзначыць, што многія лідары людоўцаў былі незадаволены тым, што на прымусовую парцэляцыю пайшлі перш за ўсё ўрадавыя землі і адзначалі, што такім чынам памешчыкі «хацелі дзяржаўнымі землямі заткнуць сялянам рот» [17, s. 23]. Для непасрэднай рэалізацыі рэформы стваралася Галоўная Зямельная Ўправа (Główny Urząd Ziemski).

Асаблівыя спрэчкі разгарэліся наконт 6 артыкула пастановы аб памеры максімума землеўладання. Людоўцы выступалі за яго вызначэнне спачатку ў 100–200 моргаў, потым 60–300, у той час як памешчыкі – ад 1 000 да 1 500 моргаў. Калі невялікая частка незадаволеных сялянскіх паслоў са спевамі здзеклівых песень пакінула залу паседжанняў, то ў выніку бакам удалося прыйсці да нетрывалага паразумення: пры галасаванні 183 паслы выказаліся «за», а 182 – «супраць» [5, s. 106; 7, s. 160]. Паводле азначанай пастановы права карыстання гэтымі артыкуламі гублялі асобы, пакараныя раней за самавольны захоп чужой маёмасці, што датычылася перш за ўсё рэвалюцыйна настроенага сялянства, а потым таксама выкарыстоўвалася памешчыкамі пры кары сялян за патраву іх жывёлай сваіх пасеваў [15, s. 138].

У цэлым закон складаўся з 16 артыкулаў і рэзалюцыі, паводле яго аграрны лад краіны павінен апірацца «на моцныя, здаровыя і здольныя да інтэнсіўнай прадукцыі гаспадаркі, заснаваныя на праве прыватнай уласнасці, featured рознага тыпу і памеру» [4, s. 11; 17, s. 21]. Уладальнікамі зямлі маглі



Палесдзу

быць толькі непасрэдна на ёй працуючыя асобы, за выключэннем тых надзелаў, якія знаходзіліся ва ўласнасці сельскага і гарадскога самакіравання. Нягледзячы на тое што гэтая пастанова так і не ўступіла ў законную сілу, яна аказала значны ўплыў на далейшую распрацоўку аграрнага заканадаўства, а яе пастулаты знайшлі працяг у наступных законах па зямельнаму пытанню [1, с. 122].

Прынятая пастанова была адной з самых значных актаў Заканадаўчага Сейма і атрымала ў краіне шырокі водгук. У перыядычным друку людоўцаў адзначаўся вялікі поспех у прыняцці азначанай пастановы і выкананне тым самым імі перадвыбарчых абяцанняў, падкрэслівалася яе станоўчая роля ў развіцці сельскай гаспадаркі – дзякуючы ёй на месцы «старой Польшчы» павінна была ўзнікнуць «новая Польшча» [16, s. 30; 20, s. 70]. Адначасова сялянскія партыі звярталі ўвагу сялянства на неабходнасць захоўваць спакой і дачакацца непасрэднай рэалізацыі гэтай пастановы. Ацэнкі правай прэсы былі неадназначнымі і ў многіх выпадках выказвалася занепакоенасць далейшым лёсам памешчыкаў як класа, выказваліся надзеі, што пастанова ад 10 ліпеня 1919 г. так і не будзе праведзена ўрадам у жыццё і нават гучалі нешматлікія заклікі да яе байкоту [16, s. 29; 19, s. 213–214].

14–16 снежня 1919 г. адбылася нарада кіраўніцтва ПНП «Вызваленне», на якой было прынята рашэнне аб несупыннай барацьбе за ажыццяўленне аграрнай рэформы і аб выхадзе з сумеснага з ПНП «Пяст» сеймавага Клуба, што і было ажыццёўлена, але 34 паслы непадпарадкаваліся гэтаму рашэнню і перайшлі ў шэрагі пястаўцаў, у выніку чаго ў «Вызваленні» засталіся толькі 23 мандаты і яе ўплыў на палітыку Сейма значна зменшыўся [22, s. 51].

У такіх неспрыяльных абставінах урад здолеў выканаць запланаваную аграрную рэформу толькі часткова, акрамя таго, на ажыццяўленне ў ІІ Рэчы Паспалітай аграрных пераўтварэнняў вельмі вялікі ўплыў аказваў ход савецка–польскай вайны (1919–1921 гг.). Вясною–летам 1920 г. Чырвоная Армія падыйшла да прыгарадаў Варшавы, несучы з сабою рэвалюцыйныя лозунгі. У такіх умовах многія сяляне і сельскагаспадарчыя рабочыя выказваліся ў падтрымку бальшавікоў, а пануючыя класы адчулі сур'ёзную небяспеку і неабходнасць пайсці на значныя саступкі сялянству. 1 ліпеня 1920 г. быў створаны кааліцыйны Урад Нацыянальнай Абароны (Rząd Obrony Narodowej) на чале з В. Вітасам, а таксама з Юліўшам Панятоўскім (Juliusz Poniatowski, ПНП «Вызваленне») у яго складзе, што дало людоўцам значныя магчымасці ў справе далейшай палітычнай дзейнасці па абароне сялянскіх інтарэсаў і прыняцці новага аграрнага закона [14, s. 60].

У такіх складаных умовах у Сейме ізноў распачаліся слуханні па пытанню прыняцця новага закона аб аграрнай рэформе «Ustawa o wykonaniu reformy rolnej» («Закон аб выкананні аграрнай рэформы») і 15 ліпеня 1920 г. ён быў адзінагалосна адобраны з мэтаю заахвоціць такім чынам сялян да службы ў войску [9, s. 627]. Як адзначаў найбольш вядомы тагачасны тэарэтык польскай аграрнай навукі і суаўтар закона Францішак Буяк (Franciszek Bujak, блізкі да ПНП «Пяст»): «пагрозлівае становішча дзяржавы патрабавала, каб ніводзін сродак, які б узмацніў у арміі і народзе дух трымаласці і станоўчай волі да перамогі не быў праігнараваны. Аграрная рэформа слушна залічана да такіх сродкаў, чаму сведчаннем з'яўляецца тое, што была прынята ў Сейме адзінагалосна пасля кароткай справаздаўчай прамовы» [7, s. 163; 20, s. 72].

Паводле азначанага закона сяляне атрымалі больш магчымасці па надзяленні зямлёй. Згодна аграрнага закона ад 15 ліпеня 1920 г. 80% парцэляванай зямлі павінна накіроўвацца на надзяленне малазямельнага і беззямельнага сялянства пры прызнанні прывілеяў заслужаных ветэранаў (асаднікаў) і вайсковых інвалідаў; гарантавалася надзяленне зямлёй парабкаў і сельскагаспадарчых рабочых, якія страцяць зямлю пры парцэляцыі маёнткаў. З мэтай ажыццяўлення парцэляцыі памешчыцкіх маёнткаў планавалася стварэнне дарадчых гмінных і павятовых зямельных камісій. Паводле закона дзяржава набывала зямлю ў памешчыкаў у памеры 50% ад яе рынкавага кошту ў дадзенай мясцовасці. Рэформа ахапіла ў першую чаргу дзяржаўныя маёнткі і царкоўныя землі. Права да набыцця зямлі пазбаўляліся асобы, пакараныя за самавольны захоп зямлі, ваенныя злачынствы альбо антыўрадавую дзейнасць. На загаспадараванне сялянам прадастаўлялася ільготныя доўгатэрміновыя банкаўскія крэдыты з ствараемага Дзяржаўнага Сельскагаспадарчага Банка (Państwowy Bank Rolny) [19, s. 312–313]. Прымусоваму выкупу падлягалі землі звыш 60 ці ў некаторых мясцовасцях 180 га (у выключным выпадку – больш 400 га), выказваўся прынцып «адзін уладальнік – адзін забудаваны маёнтак». Адначасова закон папярэджваў аб недапушчальнасці прымусовага выкупа высокатэхнічных і маючых вялікае эканамічнае значэнне гаспадарак [17, s. 27].

Сялянскія партыі перааціналі прыняты закон як вялікі поспех і радыкальнае выпраўленне існуючых у аграрнай сферы адносін, а ў рэчаіснасці справа была вырашана фактычна толькі напалову. У адносінах да папярэдняга аграрнага закона прынятая пастанова стала больш радыкальнай і давала сялянству больш магчымасці атрымаць дадатковую зямлю, але пры ўмове забеспячэння захавання памешчыцкага землеўладання [15, s. 154–155]. Ад рэалізацыі прынятай рэформы атрымлівалі карысць перш за ўсё багатыя сяляне, якія мелі магчымасць набыць дадатковую зямлю, у той час як Камуністычная Партыя Польшчы (Komunistyczna Partia Polski) у лютым 1921 г. ацэньвала яе як новае ашуканцтва беззямельнага і малазямельнага сялянства, якому ўнушалася, што ўся памешчыцкая зямля хутка будзе яму належыць [14, s. 61].

24 ліпеня 1920 г. Урад Нацыянальнай Абароны быў зацверджаны Сеймам. Вітас падкрэсліваў той факт, што на чале ўрада стаў селянін, чаго раней не было ні ў адной дзяржаве свету. Дзейнічаць новаму прэм'ер–міністру прыйшлося ў вельмі складаных умовах савецка–польскай вайны і неадбудаванай дзяржаўнай структуры. Вінцэнт Вітас ад імя ўрада выдаў да сялян 5 жніўня 1920 г. спецыяльную адозву, у якой адзначаў неабходнасць падтрымкі сялянамі ўрада і ўступлення ў шэрагі польскай арміі: «Ганіце прэч з вёскі і хат сваіх тых, хто ўцёк з войска, бо яны гонар нацыі заплямілі, пагарду аказвайце тым, хто ў перыяд, калі Айчына знаходзіцца ў небяспецы, калі Вам пагражае ганьба і знішчэнне, сядзіць дома, ухіляецца ад вайсковай службы… Кожны войт, кожны солтыс (стараста) павінен пільнаваць, каб з яго вёскі ўсе закліканыя пайшлі ў шэрагі войска, каб ні ў адной вёсцы не было дэзерціра і ў кожнай вёсцы (людзі) здольныя насіць зброю пайшлі да арміі» [19, s. 313–314]. З мэтаю ўзнагароджання ветэранаў савецка–польскай вайны 17 снежня 1920 г. Сеймам была прынята пастанова аб насаджэнні асадніцтва, згодна якой асаднікі на вельмі ільготных умовах атрымлівалі свабодныя землі на новадалучаных тэрыторыях, што выклікала моцнае незадавальненне мясцовых сялян, якія справядліва разлічвалі на пераход гэтых зямель на сваю карысць.

У многім дзякуючы прыняццю закона аб аграрнай рэформе шэрагі польскай арміі значна папоўніліся за кошт сялян і Польшчы ўдалося ў савецка–польскай вайне адстаяць сваю незалежнасць. Як потым адзначаў сам Вітас, у 1920 г. сялянства «здала экзамен (на вернасць Польшчы)», але і ён прызнаваў, аднак, нягледзячы на тое, што ў цэлым тагачасная вёска трымалася супраць бальшавіцкай агітацыі добра, у многіх месцах былі заўважаны спачуванне і сімпатыя да камуністычных ідэй, пры чым не толькі ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, але нават і на Пазнаньшчыне і на Памор'і [22, s. 66].

18 сакавіка 1921 г. савецка–польская вайна скончылася падпісаннем Рыжскага міра і небяспека для дзяржавы мінула, тады памешчыкі ізноў распачалі актыўную кампанію супраць прымусовай парцэляцыі. Сакавіцкая Канстытуцыя ІІ Рэчы Паспалітай (1921 г.) гарантавала права прыватнай уласнасці, таму ў гэты час у польскіх судах разглядалася шмат скарг памешчыкаў супраць мясцовых зямельных упраў, якія канфіскоўвалі іх празмерныя ўладанні. У такіх неспрыяльных умовах рэалізацыя аграрнай рэформы прыпынілася і людоўцы ізноў пачалі барацьбу за прыняцце новага аграрнага закона, але паўнамоцтвы Заканадаўчага Сейма хутка заканчваліся і гэтаю справаю павінен быў заняцца Сейм новага склікання [5, s. 107].

**Заключэнне.** Сялянскія партыі ў 1919–1922 гг. вялі ў Заканадаўчым Сейме актыўную дзейнасць па абароне сялянскіх інтарэсаў і прыняцці адпаведнага аграрнага закона. Дзейнічаць людоўцам прыйшлося ў вельмі складаных умовах, таму што большасць Сейма складалі правыя і найперш памешчыкі, якія не былі зацікаўлены ў шырокім ажыццяўленні аграрнай рэформы. Нягледзячы на ўсе цяжкасці сялянскім партыям удалося дасягнуць некаторых поспехаў і прыняцця законаў, дзякуючы якім сяляне часткова атрымалі зямлю, але барацьба за прыняцце больш адпаведнага інтарэсам сялянства закона аб аграрнай рэформе вымушана працягвалася і ў наступным.

## ЛІТАРАТУРА


1. Гарматны, В.П. Закон ад 10 ліпеня 1919 г. як першы этап заканадаўчага афармлення аграрнай рэформы на землях Заходняй Беларусі / В.П. Гарматны // Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі : матэрыялы міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі, Мінск, БДУ, 18–19 сакавіка 2011 г. – Мінск, 2011. – С. 119–122.

2. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.

3. Adamski, St. Stronnictwa Polityczne w Sejmie Polskim / St. Adamski. – Chicago : Nakładem Wydziału Narodowego Polskiego w Ameryce, 1921. – 24 s.

4. Bogusławski, A. Jaką reformę rolną uchwalił Sejm Ustawodawczy w Warszawie / A. Bogusławski. – Warszawa : Wydawnictwo Straży Kresowej, 1919. – 24 s.

5. Borkowski, J. Ludowcy w II Rzeczypospolitej : w 2 cz. / J. Borkowski. – Warszawa : Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1987. – Cz. 1. – 374 s.

6. Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodległości i II wojny Światowej, 1918–1945 / Cz. Brzoza. – Kraków : Fogra ; Warszawa : Świat Książki, 2001. – 424 s.

7. Burger, W. Ruch ludowy wobec kwestii społeczno–ustrojowych II Rzeczypospolitej / W. Burger. – Szczecin : Dział Wydawnictw WSM w Szczecinie, 1983. – 414 s.

8. Cimek, H. Walka ludowców o Polskę, jej granice i ustrój w latach 1914–1922 / H. Cimek. – Rzeszów : Wydawnictwo Uniwersytetu Rzeszowskiego, 2008. – 344 s.

9. Drewicz, M. Głęboka przemiana rewolucyjna. Sejmowa debata nad reformą rolną w Polsce w 1919 roku / M. Drewicz. – Lublin : Wydawnictwo WERSET, 2009. – 760 s.

10. Gałka, B.W. Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918–1939 / B.W. Gałka. – Toruń : Adam Marszalek, 2002. – 214 s.

11. Hemmerling, Z. Ruch ludowy w Wielkopolsce 1919–1939 / Z. Hemmerling. – Warszawa : Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1971. – 401 s.

12. Historia chłopów polskich. W 3 tomach. T. 3. Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej / pod redakcją Stefana Inglota. – Warszawa : Ludówa Spółdzielna Wydawnicza, 1980. – 715 s.

13. Historia Sejmu Polskiego. W 3 tomach. T. II, część II. II Rzeczpospolita. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1989. – 420 s.

14. Lato, St. Ruch ludowy a Centrolew / St. Lato. – Warszawa : Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1965. – 284 s.

15. Madajczyk, Cz. Burżuazyjno–obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918–1939) / Cz. Madajczyk. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1956. – 465 s.

16. Materiały źródłowe do historii polskiego ruchu ludowego : w 4 t. / Zakład Historii Ruchu Ludowego przy NK ZSL ; zebrali i opracowali St. Giza, St. Lato. – Warszawa : Ludowa Spółdzelnia Wydawnicza, 1966–1967. – T. 2 : 1918–1931. – 1967. – 542 s.

17. Reformy rolne w Polsce międzywojennej i powojennej: prawo, realizacja, skutki, problemy reprywatyzacyjne / red. Nauk.: E. Borkowska–Bagieńska, W. Szafrański. – Poznań : Wydawnictwo Naukowe Uniwersyteta im. A. Mickiewicza, 2008. – 246 s.

18. Slownik biograficzny dzialaczy ruchu ludowego. – Warszawa : Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1989. – 460 s.

19. Stankiewicz, W. Konflikty społeczne na wsi polskiej 1918–1920 / W. Stankiewicz. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1963. – 363 s.

20. Sułkowska, W. Dyskusja nad kierunkami przebydowy system agrarnego w Polsce (1918–1939) / W. Sułkowska. – Kraków : Akademia Ekonomiczna, 1993. – 180 s.

21. Śliwa, M. Ludowcy i socjaliści w parlamencie II Rzeczypospolitej / M. Śliwa. – Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 1995. – 168 s.

22. Zarys historii polskiego ruchu ludowego. W 2 tomach. T. II, 1918–1939. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1970. – 602 s.


## STRUGGLE OF THE PEASANTS PARTIES IN THE LAM MAKING SEJM OF II RZECZPOSPOLITA (1919-1922) ACCORDING TO THE AGRARIAN REFORM


***V.P. HARMATNY***



***Summary***

Article tells about the role of Law Making Sejm in solving most actual temporary questions of state building and struggle of peasants' parties in Sejm during 1919-1922 according the realization in the country agrarian reform. Shown the sharp of agrarian question in this period, described the role of agriculture in the state economy as the main produced sphere. Discussed main tenses of the agrarian laws which Sejm adopted the in 10 July 1919 and 15 July 1920.



© Гарматны В.П.



*Поступила в редакцию 19 сентября 2014г.*



Полесгу